Эрык Табэры → Сцяпан Латыпаў

Шаноўны і дарагі Сцяпан!

Я пішу вам са значным хваляваннем, бо для мяне гэта выключны момант. У мяне столькі ўсяго на сэрцы, але мной рухаюць галоўным чынам эмоцыі, якія цяжка пакласці на паперу. Мы не знаёмыя, і тым не менш, у мяне такое адчуванне, што мы блізкія сябры. Людзі, якія хочуць жыць вольна, пэўным чынам звязаныя між сабой, і не важна, наколькі далёка яны адно ад аднаго жывуць і на якой мове размаўляюць. Тым больш, калі яны з краін, дзе свабода не дадзенасць. Мы, чэхі, ужо свабодай нейкі час цешымся, вас, я веру, гэта неўзабаве чакае.
Я ведаю, што ў мяне няма практычнай магчымасці, як вас падтрымаць. Але хачу вам прынамсі даць ясны знак і абяцанне, што дыктатарскаму рэжыму ніколі не ўдасца заплямiць ваша імя. Мы ведаем, што ўсе яго абвінавачанні сфабрыкаваныя. У рэжымах накшталт Лукашэнкаўскага знаходжанне ў турме бывае адзнакай прыстойнасці і не наадварот. Зрэшты, я пішу вам з краіны, у якой першы дэмакратычны прэзідэнт Вацлаў Гавэл і першы свабодны міністр замежных спраў Іржы Дынстбір, перш чым занялі свае пасады, прайшлі праз некалькі турмаў. І пасадзіла іх туды, гэтаксама як вас, таталітарная ўлада.
За падзеямі ў Беларусі я сачу праз СМІ ці сацыяльныя сеткі і вельмі захапляюся людзьмі, якія, ведаючы, што ім пагражае, зноў і зноў выходзяць, каб паказаць людзям без твараў, наколькі прагнуць свабоды. І часта на мяне накатвае моцнае ўзрушэнне ад той далікатнай адвагі з аднаго боку і гневу на гвалтаўнікоў з другога. Вы стаіцё перад уяўнай перавагай у сіле, у якой у руках нібыта ўсе козыры, але ў яе няма справядлівасці і сардэчнасці. І менавіта таму свет на вашым баку. Яны бароняць свае выгады, сваю ўладу, але вы бароніце чалавечнасць.
Я самакрытычна мушу прызнаць, што мне ніколі б не прыйшло да галавы, што менавіта Беларусь дасць усяму свету такі ўрок. Вы сталі для нас натхненнем.

Шаноўны і дарагі Сцяпан, мы амаль аднаго ўзросту. Я веру, што аднойчы ў нас надарыцца нагода напісаць адно аднаму ці нават асабіста сустрэцца як прадстаўнікам двух нудных свабодных грамадстваў. У нашых лістах ужо не будзе ані згадкі пра турму ці пагрозы, а толькі, скажам, пра надвор’е, добры канцэрт або фільм.

Я думаю пра вас.
Эрык

## Эрык Табэры (нар. 1977)
чэшскі журналіст, публіцыст, галоўны рэдактар штотыднёвіка “Respekt”



Скончыў бакалаўрыят па спецыяльнасці журналістыка на факультэце сацыяльных навук Карлавага ўніверсітэта, тамсама нейкі час вывучаў паліталогію. У рэдакцыі часопіса “Respekt” пачаў працаваць яшчэ ў 1997 г., з 2009 г. стаў яго галоўным рэдактарам.

У сваёй каментатарскай і публіцыстычнай дзейнасці займаецца найперш унутранай палітыкай. Ён лаўрэат некалькіх прэстыжных прэмій, напр., Журналісцкай перапёлкі для журналістаў да 33 гадоў (2002), журналісцкай прэміі імя Ф. Пероўткі (2008) ці Журналісцкай прэміі за 2011 год.

Шэраг поспехаў зазнаў і ў публіцыстыцы. У 2006 г. выйшла яго першая кніга “Не замінайце, мы кіруем” (прэмія Тома Стопарда). У 2007 г. паводле кнігі ўзнік аднайменны дакументальны фільм, які атрымаў прэмію “Trilobit”. Пакуль апошні значны поспех Эрыка Табэры – прэмія Magnesia litera (2018) за трэцюю кнігу “Пакінутае грамадства: чэшскі шлях ад Масарыка па Бабіша”.

# Эрык Табэры

→

# Сцяпан Латыпаў



## Сцяпан Латыпаў (40 гадоў)
арбарыст і прамысловы альпініст.

У двары яго дому на сцяне трансфарматарнай будкі ўзнікла графіці т.зв. дыджэяў перамен, якое стала сімвалам пратэсту, і хоць яго штоноч зафарбоўвалі на загад зверху, мясцовыя жыхары яго штораз аднаўлялі. Калі камунальнікі аднаго разу прыйшлі да графіці ў суправаджэнні людзей у цывільным, якія цвердзілі, што яны з міліцыі, Сцяпан закрыў сабой графіці і патрабаваў паказаць пасведчанне. Тады да Сцяпана далучыліся іншыя жыхары, і камунальнікі з міліцыяй адышлі ні з чым. Аднак праз пару дзён да яго ўварваліся дадому, ён быў збіты і арыштаваны. Падчасператрусу ў яго дому знайшлі хімікаты, якія Сцяпан выкарыстоўваў у сваёй працы пры вынішчэнні баршчэўніку, і яго абвінавацілі ў намеры ўжыць атруту супраць міліцыі. Пасля таго, як пра гісторыя Сцяпана Латыпава разляцелася па сацыяльных сетках, ён быў апазнаны на ранейшым відэа, на якім раздае кветкі ўдзельніцам першага жаночага маршу.